**Сутула, Г.** На граніце / Г. Сутула // Веснік Глыбоччыны. — 2014. — 11 студз. — С. 2.

## НА ГРАНІЦЕ



*Баец успамінае мінулыя дні*



*Першае фота Анатоля Кучынскага з Тэрмеза*

***Афган! Ты как рана в душах солдат.***
***Я знаю: ты будешь ночами мне сниться.***
***Ведь здесь вдоль дорог обелиски стоят***
***До самой границы, до самой границы.***
***Февральская ночь, ледяная броня,***
***На скалах свет фар, автоматы – в бойницах…***
***Колонна уходит из-под огня***
***У самой границы, у самой границы…***

### Пад аховай Тэрмезскай флатыліі

24 снежня 1979 года Д. Ф. Усцінаў падпісаў дырэктыву № 312/12/001, згодна якой было прынята рашэнне «аб уводзе некаторых кантынгентаў войск на тэрыторыю дэмакратычнай рэспублікі Афганістан з мэтай аказання дапамогі сяброўскаму афганскаму народу».

Ва Урадзе СССР меркавалі, што савецкія войскі стануць там гарнізонамі, возьмуць пад ахову важнейшыя прамысловыя і грамадзянскія аб’екты. Граніцу з Афганістанам было загадана перайсці ў 15.00 па маскоўскім часе (у 17.00 па кабульскім) 27 снежня 1979 года.

Але ўжо раніцай 25 снежня па наведзеным пантонным мосце праз раку Амудар’я пераправіўся 4-ы батальён 56-й гвардзейскай дэсантна-штурмавой брыгады 40-й арміі Туркестанскай ваеннай акругі. Перад ім стаяла задача захапіць высакагорны перавал Саланг на дарозе Тэрмез–Кабул, каб забяспечыць па ёй бесперашкодны пераход савецкіх войск.

* * *

У сувязі з уводам абмежаванага кантынгенту савецкіх войск у Афганістан і ўскладненнем сітуацыі на савецка-афганскай граніцы ў 1981 годзе для забеспячэння надзейнасці яе аховы на ўчастках рэк Амудар’і і Пяндж у адпаведнасці з рашэннем Урада СССР быў сфарміраваны асобны дывізіён вартавых катэраў (45-ы АДВК) – так званая Тэрмезская флатылія пад камандаваннем камандзіра дывізіі, капітан-лейтэнанта Ю. Васільева.

У 1988 годзе на базе 45-й АДВК была разгорнута асобная брыгада вартавых караблёў (22-я АВВК, в/ч 9873). У яе склад уваходзілі восем караблёў тыпу «Шмель», падраздзяленне з дзесяці вартавых катэраў, узвод малых катэраў тыпу «Пелікан» і «Бусел» колькасцю дваццаць штук. У берагавой службе была таксама аўтарота, спецыялісты-тэхнікі, фельдшары, повары. Агульная колькасць асабовага складу брыгады – 500 чалавек.

Зона адказнасці брыгады праходзіла па рачным участку ад Ніжняга Пянджа (Таджыкская ССР) да населенага пункта Басагі (Туркменская ССР) і складала 300 кіламетраў.

Ваеннаслужачыя 22-й брыгады не толькі ахоўвалі граніцу Савецкага Саюза на рачным участку ў выглядзе рухомага дазору, але і суправаджалі караваны баржаў; выконвалі баявыя заданні ў інтарэсах спецпадраздзяленняў пагранічных войск КДБ СССР, што знаходзіліся на тэрыторыі Афганістана; дэсантавалі войскі і грузы на афганскі бераг; праводзілі сумесныя баявыя аперацыі з разведчыкамі; перапраўлялі афганскіх інфарматараў; ахоўвалі стацыянарныя масты і пераправы. Дазорную службу ўздоўж лініі граніцы экіпажы караблёў і катэраў неслі кругласутачна. Выходзілі ў верх па рацэ, выключалі рухавікі і дрэйфавалі па цячэнні да Ніжняга Пянджа, «праслухоўваючы» мясцовасць. Катэры «Буслы» хадзілі ў дазор толькі парамі. Кожная група караблёў з катэрамі працавала ў сваёй зоне, якая была «прывязана» да пэўнага ўчастка пагранічнай заставы.

## «Я вярнуўся, мама!»

15 лютага 1989 года савецкія войскі былі выведзены з Афганістана. А пагранчасці КДБ ахоўвалі савецка-афганскую граніцу да красавіка. Наш зямляк-глыбачанін Анатоль Расціслававіч Кучынскі, які служыў старшым матросам в/ч 9873 22-й асобнай дывізіі вартавых катэраў у Тэрмезе, дэмабілізаваўся 24 кастрычніка 1990 года. Пра лёс маленькага чалавека на вялікай вайне і пойдзе аповед.

Малога Толю прывучаў да тэхнікі бацька Расціслаў Міхайлавіч. Ён працаваў вадзіцелем у будаўнічай арганізацыі, часта ездзіў у камандзіроўкі за цэментам і цэглай і браў з сабой сына. Таму і не дзіва, што хлопчык сеў за руль аўтамабіля тады, калі яшчэ ногі даставалі да педаляў газу і тормазу.

Дзіцячую мару стаць вадзіцелем дапамагло яму ажыццявіць Глыбоцкае СПТВ-168 механізацыі. Атрымаўшы прафесію, Анатоль працаваў у аўтапарку, развозіў па магазінах хлеб.

Затым была павестка з ваенкамата і медкамісія.

– Я прызнаўся, што баюся вышыні, таму ў дэсантнікі мяне не ўзялі. Тры месяцы вучэбкі адбыў у Анапе. Там упершыню ўбачыў мора і горы, – расказвае Анатоль Расціслававіч. – Горад курортны, надвор’е спякотнае, але нам было не да загару. Праз тры месяцы нас пагрузілі ў цягнікі і сказалі: «Паедзеце на поўдзень. Будзеце ахоўваць Гарбачова».

Прыпынак зрабілі ў прыгранічным з Афганістанам узбекскім горадзе Тэрмез. Я трапіў у марчасць № 9873 пагранвойск КДБ СССР, што ўваходзілі ў склад Чырванасцяжнай Сярэднеазіяцкай пагранічнай акругі.

Тэрмез размяшчаўся ўздоўж правага берагі ракі Амудар’я. Такой ракі ў Беларусі я не бачыў. Пазней даведаўся, што працякае яна па тэрыторыях чатырох дзяржаў і пачынаецца пры зліцці рэк Вахш і Пяндж. Яе даўжыня – тысяча чатырыста пятнаццаць кіламетраў. Ад Тэрмеза да Ташкента было паўтысячы кіламетраў, да ваеннага аэрадрома «Какайда» – 40. Спякота – неймаверная, а дажджы – рэдкасць. З мая да верасня было да +40°. Зіма вільготная, з плюсавой тэмпературай. Пасля Беларусі з умераным кліматам Тэрмез здаваўся распаленым пеклам, – успамінае суразмоўца.

Старшы матрос Кучынскі спачатку вадзіў Камаз, на якім падвозіў паліва да вартавых катэраў, затым на УАЗе вазіў камандзіра.

– Калі пераязджалі праз Амудар’ю на афганскі бок, заўсёды трымалі зброю «на ўзводзе». Днём афганцы былі міралюбівыя, займаліся гаспадаркай, авечак, коз трымалі, нават бульбу садзілі, а як сцямнее – станавіліся салдатамі. Аднойчы ў метрах ста ля дарогі, па якой я ехаў, узарваўся снарад, але ніхто з нашых не пацярпеў. А калі сядзелі вечарам у кубрыку, з таго боку Амудар’і афганцы паслалі нам смяротнае «прывітанне»: куля разбіла аконную шыбу. І смерць бачыў, і з грузам «чорнага цюльпана» ляцець прыйшлося. Страшна было..., – гаворыць Анатоль Расціслававіч. – Небяспечна было ўсюды, але я прайшоў усю вайну і не быў у сітуацыі выбару: страляць самому ці даць застрэліць сябе. Маё шчасце, што не прыйшлося браць грэх на душу і забіваць чалавека.

Анатоль не адразу напісаў бацькам, што служыць на афганскай граніцы. Больш расказаў, калі быў у водпуску. Дзесяць дзён давалі на адпачынак і дзесяць на дарогу. Каб больш пабыць дома, Анатоль перасіліў страх вышыні і паляцеў самалётам...

На чужыне за радасць было сустрэць земляка-беларуса, а калі глыбачаніна, – радасць падвоеная. У тым жа Тэрмезе служыў Валерый Грэмітскіх з Глыбокага, які быў на год старэйшы за Анатоля, і Аляксей Крэмес, які прызываўся на год пазней. Хоць сустракаліся не часта, адчувалася прысутнасць свайго чалавека.

Што датычыць узнагарод, то ёсць яны і ў Анатоля Кучынскага. Праўда, мужчына ў гэтым ніякай асабістай заслугі не бачыць.

– Я добрасумленна служыў па загадзе радзімы і не лічу гэта за подзвіг, – кажа ён.

Тым не менш служба нашага земляка на граніцы ацэнена Граматай Вярхоўнага Савета СССР, медалямі «Ад удзячнага афганскага народа» і «Воіну-інтэрнацыяналісту».

Дэмабілізаваўся Анатоль Кучынскі ў кастрычніку 1990 года. Не прызнаўся, што загнаілася рана на назе ад асколка, а то прыйшлося б далечвацца ў ваенным шпіталі.

Хворая нага прывяла хлопца ў паліклініку і ... дапамагла ажаніцца. Праз год медсястра Вольга, якая рабіла працэдуры, стала жонкай Анатоля. Яшчэ праз год у маладой сям’і нарадзілася дачка, якая сёння ўжо студэнтка ВНУ.

– У 2007 годзе мы атрымалі кватэру. З узятых на той час на будаўніцтва 60 мільёнаў рублёў крэдыту, трэцюю частку аплаціла дзяржава. Была мне льгота, як афганцу, і пры пакупцы прадуктаў праз магазін «Ветэран». Ну а ўсё астатняе рабіў сам, – кажа Анатоль Расціслававіч.

Мы гартаем яго дэмбельскі альбом, а разам з ім старонкі памяці, у якой няма тэрміну даўнасці.

***

За гады афганскай вайны Савецкі Саюз страціў 147 танкаў, 1314 бронемашын, 510 інжынерных машын, 11 тысяч 369 грузавікоў і бензавозаў, 433 артылерыйскія сістэмы, 118 самалётаў, 333 верталёты. Да 40% удзельнікаў вайны па вяртанні на радзіму мелі патрэбу ў кваліфікаванай дапамозе псіхолагаў. З 1979 па 1989 без вестак прапалі 270 ваеннаслужачых...

Анатоль Кучынскі быў у ліку тых, хто, пераступіўшы парог бацькоўскага дому, мог з радасцю сказаць: «Я вярнуўся, мама!»

**Галіна Сутула**

**Фота Алены Менжынскай**